

# Адданасць **жывапісу**

1 ■ Уладзімір Іванавіч Пракапцоў на адкрыцці выставы «Пад знакам бясконцасці».
2 ■ Гармонія зямнога і нябеснага. Памяці Веры. Палатно, алей. 2023.
3 ■ На Радаўніцу. Светлай памяці бацькі. Палатно, алей. 2004.

**Надзея Усава**

*Фота Уладзіміра Шлапака і Змітра Казлова*

Выстава заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, кандыдата мастацтвазнаўства Уладзіміра Іванавіча Пракапцова «Пад знакам бясконцасці» была прысвечана 70-годдзю з дня нараджэння і 25-годдзю дзейнасці на пасадзе генеральнага дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея.
Выставу склалі тры разнапланавыя раздзелы: уласна жывапісны, бібліяграфічны (у вітрынах прадстаўлены мастацтвазнаўчыя працы, каталогі і кнігі Уладзіміра Пракапцова пра Фердынанда Рушчыца і Вітольда Бялыніцкага-Бірулю ды іншыя за апошнія 25 гадоў, кнігі яго аўтарства з серыі «Славутыя мастакі з Беларусі») і мультымедыйны (у вылучанай зоне на экране ішлі інтэрв'ю з У.І. Пракапцовым, у якіх ён выступае як дырэктар музея, а таксама разважае аб месцы жывапісу і мастацтвазнаўства ў яго творчай дзейнасці). Работы прадстаўлены са збораў Нацыянальнага мастацкага музея, Музея горада Мінска і асабістых збораў мастака.

Назву выставы аўтар абраў не выпадкова: Уладзімір Іванавіч наогул адзначае нумералогію і яе сімволіку. Напрыклад, адкрыццё яго персанальных выстаў нязменна прымеркавана да 8 жніўня і 8:00 гадзін раніцы: гэта дакладная дата і гадзіна яго нараджэння па расказах маці. «Знак бясконцасці — гэта таксама васьмёрка, толькі пакладзеная на бок», — кажа мастак.
Назва сімвалічная і філасафічная, паколькі Пракапцоў успрымае працэс творчасці і дасягнення мастацкіх вынікаў як бясконцае разважанне і ўдасканаленне ў жывапісе. Вядома, за гады творчай дзейнасці паўстала нямала карцін, у невялікую залу ўмясцілася крыху больш за 30, якія прайшлі строгі аўтарскі і куратарскі адбор.
«Для мастака ўсе карціны — яго дзеці, усе выпакутаваныя, адмаўляцца ад любой цяжка, але даводзіцца, — лічыць аўтар. — Як музейшчык я ведаю, што нельга перагружаць прастору, а як мастак хацеў бы паказаць больш».
Гэтая выстава, як і ўсякая юбілейная, носіць выніковы і аўтабіяграфічны характар. Кожная карціна так ці інакш адлюстроўвае тую ці іншую падзею і мастацкі аналіз пэўнага перыяду жыцця мастака: час вучнёўства, мастацкай сталасці, рэфлексіі аб перажытым. Гэта часта выказана літаральна — праз інсталяцыю сваёй постаці ў кантэкст беларускіх культурных цэнтраў, не канкрэтных, але беспамылкова адгадваных як нацыянальныя.
Уладзімір Пракапцоў выступае на выставе шматаблічна — як пейзажыст і партрэтыст, майстар сімвалічнай карціны-



2

нацюрморта, мастацтвазнаўца і кіраўнік буйнога нацыянальнага музея.
Умоўна жывапісную частку гэтай выставы можна падзяліць на некалькі тэм: прысвячэнне галоўным мясцінам, дзе прайшла маладосць і ўсё жыццё Пракапцова, — гарады Віцебск і Мінск, бацькоўскія мясціны, яго малая радзіма вёска Жгунская Буда ў Добрушскім раёне Гомельскай вобласці, — напісаныя з любоўю і пяшчотай краявіды вулачак роднай вёсачкі, якая паступова занепадае, родны лірычны пейзаж Гомельшчыны, што адлюстроўвае заклапочанасць мастака-грамадзяніна наступствамі Чарнобыльскай трагедыі, якая закранула гэтую зямлю. У яго працах можна ўбачыць рысы рамантызму, некаторыя з іх азначаны добрай часткаю фантазійнасці. Гэта асаблівая рыса творчасці Пракапцова — чалавека-прыдумшчыка, адкрытага рызыкоўным эксперыментам. Мастак дорыць свае карціны музеям (найбольш — Добрушскаму, дзе існуе галерэя яго імя), і, як ён падкрэслівае, толькі тры з чатырнаццаці закуплены Мастацкім музеем за 25 гадоў яго дырэктарства
Пейзаж сімвалічны, нават містычны практыкаваў аўтар у апошняе дзесяцігоддзе, працятае рэфлексіяй аб лёсе сваёй сям'і, ранняга адыходу з жыцця старэйшага брата. Гэта адлюстравана ў матыве вясковых могілак з высокімі хвоямі, урачыстага шэсця людзей у дні памінання продкаў («На Радаўніцу. Светлай памяці бацькі», «На Каляды»).
І нарэшце, новыя краявіды мастака, напісаныя спецыяльна для гэтай выставы: эпічныя віды Валожыншчыны, Віцебшчыны, з серыі «Беларусь — азёрны край», мясціны Фердынанда Рушчыца — Багданава. Ранні студэнцкі пейзаж роднага Палесся паказвае, што гэтая тэма была блізкая Пракапцову з юнацтва. Яны склаліся ў своеасаблівы трыпціх па агульнасці колеравай гармоніі, хоць першапачаткова такой задумы ў мастака не было. Сузіральнасць і шчыльная яркая лапідарная колеравая гама, любоў да адкрытага колеру, абагульненне, адыход ад нязначных бытавых дэталяў робіць яго канкрэтныя пейзажы рэальных месцаў сімвалічным чынам радзімы. Творы Пракапцова пазнавальныя, мастак знайшоў свой стыль.
Шлях у мастацтва заслужанага дзеяча мастацтваў Уладзіміра Пракапцова ляжаў ад першых самастойных малюнкаў у школьнай насценгазеце роднай вёскі да чорнай мантыі ганаровага акадэміка Расійскай акадэміі мастацтваў. Уладзімір Іванавіч успамінае, як ён маленькім хлопчыкам меў у якасці ўзору для змалёўвання толькі агранамічны атлас, дзе былі вельмі ярка і сакавіта намаляваны розныя плады — памідоры, яблыкі,грушы. Ён спрабаваў перадаць іх прыгажосць чорнымі ці каляровымі алоўкамі і тады ўжо зразумеў, што хоча стаць мастаком, хоць у вёсцы не было ані студыі, ні Дома піянераў, дзе вучылі б малюнку. І бацька настойліва раіў стаць аграномам — паважаным у вёсцы чалавекам. Але маці, Марыя Андрэеўна, сельская настаўніца, падтрымала сына, і Уладзімір паступіў на мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута імя Кірава і не шкадуе аб тым, што вучыўся не ў сталіцы. Юнацтва яго прайшло ў цудоўным горадзе, авеяным легендамі карцін Шагала і Малевіча, наватараў УНОВІСа. Студэнты літаральна адчувалі, што ўсё тут было прасякнута мастацтвам. Выдатныя настаўнікі А.І. Арлоў, А.В. Гаўрушка навучалі іх жывапісу, разам ездзілі на пленэры. Педагог А.В.Жукава, куратар групы, саммааддана апекавалася студэнтамі. Акварэліста Івана Міхайлавіча Сталярова, куратара курса, Уладзімір Пракапцоў лічыць сваім галоўным настаўнікам. Віцебску — гораду маладосці — прысвечана некалькі рамантычных, нават эпатажных карцін Пракапцова, напісаных ужо ў 2000-я («Начны Віцебск, «Мой Віцебск», «Віцебскія мроі пра Парыж»).



3

Але быць толькі мастаком падалося яму недастатковым. У той жа час Уладзіміра Пракапцова захапіла навука аб мастацтве, і ён паступіў у аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук, дзе займаўся тэмай манументальнага жывапісу Беларусі

XX стагоддзя. Напісанне дысертацыі дало яму магчымасць пазнаёміцца з многімі вядомымі мастацтвазнаўцамі, такімі як Леанід Ніканоравіч Дробаў, Віктар Фёдаравіч Шматаў, мастакамі. На ўласна жывапіс заставалася няшмат часу, яшчэ менш, калі ў 45 гадоў пасля працы ў Апараце Савета Міністраў ён стаў дырэктарам музея і прысвяціў сябе гэтай справе, а жывапісам давялося займацца ўрыўкамі, у адпачынках і ў выхадныя дні. Але ўсё роўна Уладзімір Іванавіч не пакідаў жывапіс, не выпадаў з мастацкага поля, і спадчына яго дастаткова шырокая. «Жывапіс у гэтыя гады стаяў у мяне не на першым месцы, я быў перш за ўсё адміністратарам, цалкам аддаваўся гэтай працы, таму што трэба было падымаць музей. Але, разам з тым, калі я не буду займацца жывапісам і мастацтвазнаўствам, мне будзе цяжэй зразумець і ацаніць здабыткі іншага мастака. І ніхто не робіць мне зніжку з-за маёй пасады і недахопу часу — глядзяць на карціны і судзяць іх, вынік маіх намаганняў — казаў ён. — Хочацца быць нараўне з мастакамі-жывапісцамі, не адставаць ад іх». Гэта патрабавала звышнамаганняў, павышанай энергіі і абмежаванняў — у сне, у адпачынку і г.д.

Аспірантура ў Мінску падарыла знаёмства з будучай жонкай, з якой пражыта ўсё жыццё, — мастацтвазнаўцам, педагогам і піяністкай Верай Масленікавай, якая заўчасна пайшла з жыцця пасля цяжкай хваробы два гады таму. Светлай яе памяці на гэтай выставе прадстаўлены партрэт in memoria «Суладдзе зямнога і нябеснага. Памяці Веры». Пасля выставы ён пераедзе на новае месца экспанавання — у рэкрэацыю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, дзе доктар мастацтвазнаўства, прафесар і заснавальніца школы кампаратыўнага мастацтвазнаўства Вера Паўлаўна Пракапцова выкладала больш за 40 гадоў. Гэты партрэт пісаўся больш як паўгода, у музейным кабінеце, на вачах супрацоўнікаў, удумліва, з увагай да кожнай дэталі, па фатаграфіях і асабістых успамінах. Вера Паўлаўна была не толькі інтэлігентнай жанчынай, добрай жонкай і маці двух сыноў — Антона і Паўла, але і высокім прафесіяналам і ў музыцы, і ў выяўленчым мастацтве: яна нарадзілася і расла ў сям'і народнага мастака Беларусі Паўла Масленікава. Была першым крытыкам і дарадцам твораў і артыкулаў Уладзіміра Іванавіча, яна фарміравала яго як асобу, мастака і кіраўніка нашага музея. Гэта была прыгожая пара людзей, створаных адно для аднаго.

Нібы ў пандан да гэтага партрэта Уладзімір Іванавіч напісаў варыянт свайго аўтапартрэта 1997 года «Present Indefinite» («Сапраўднае нявызначанае»), дадаўшы да назвы падзаголовак «Страта». Гульня сэнсаў назвы складае і сутнасць карціны: гэта час жыццёвых перажыванняў і сумневаў.

На выставе таксама дэманстраваліся шматлікія дакументальныя фільмы, знятыя за час 25-гадовага самаадданага служэння (інакш не назавеш) Уладзіміра Іванавіча на пасадзе дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея. Асаблівы экспанат — узнёслы партрэт Пракапцова, зроблены народным мастаком Беларусі Львом Гумілеўскім і спецыяльна адліты да выставы ў пластыку яго сынам Сяргем Гумілеўскім, што служыў камертонам выстаўкі жывапісца, — пакуты і радасці творчасці, вечнае чалавечае сумненне і нашы страты.Выстава атрымалася суцэльнай і ў той жа час разнастайнай, яна паказала ўсе грані творчасці мастака, які, нягледзячы на складанасці, назаўсёды застаўся адданы мастацтву.


4


5


6



7



8



9

4 ▪ Вераснёвая мелодыя пад Ракавам. Кардон, алей. 1979.
5 ▪ Present Indefinite. Палатно, алей. 1999.
6 ▪ На Каляды. Раніца. Палатно, алей. 2011.
7 ▪ Беларусь — азёрны край. Палатно, алей. 2021.
8 ▪ Полацк. Святы дзень. Палатно, алей. 2007.
9 ▪ Віцебскія мроі пра Парыж. Палатно, алей. 2000–2010.